# ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ Ў СІСТЭМЕ ДЗЕЙНАСЦІ ЦЭНТРАЎ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ І ДАМОЎ РАМЁСТВАЎ

**Р. Ф. ШАУРА,**
*канд. мастацтвазнаўства, праф., загадчык каф. народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У якасці асноўнай мэты Канцэпцыя эстэтычнага выхавання прадугледжвае «гарманічнае духоўна-эстэтычнае фарміраванне асобы» ва ўмовах дэмакратычнага грамадства з яго гуманістычнай накіраванасцю і прыматам агульначалавечых каштоўнасцей. Пад гармоніяй разумеецца арганічнае спалучэнне рацыянальна-разумовага развіцця чалавека з эмацыянальна-вобразным развіццём яго асобаснай структуры. Адсюль асноўная задача эстэтычнага выхавання — мэтанакіраванае развіццё рознабаковых якасцей чалавека, перш за ўсё эмацыянальна-вобразнага складальніка. Прычым ад эфектыўнасці эстэтычнага выхавання залежыць ступень духоўнай дасканаласці чалавека [2].

**Эстэтычнае выхаванне** уяўляе сабой працэс фарміравання і развіцця эстэтычнага патэнцыялу, які ўключае адпаведныя патрэбнасці асобы, пачуцці і густы. Такое тлумачэнне паняцця працэсу дапамагае растлумачыць прыроду творчасці, яе пачуццёва дасканалую аснову.

Кожны чалавек здольны атрымліваць эстэтычную асалоду пры рэалізацыі сваіх здольнасцей, таму асноўнай задачай эстэтычнага выхавання з'яўляецца фарміраванне эстэтычных адносін у грамадска значнай стваральніцкай дзейнасці. Такім чынам, чалавек ператвараецца ў творцу эстэтычных каштоўнасцей, пастаянна суадносячы змест з гарманічнай формай, развіваючы пры гэтым адпаведны густ і пачуццё меры [1].

Адным са сродкаў эстэтычнага выхавання з'яўляецца мастацкае развіццё асобы. Асноўная мэта мастацкага развіцця — максімальнае развіццё духоўнага свету чалавека, фарміраванне ў яго высокага ўзроўню мастацка-вобразнага мыслення, актыўных творчых адносін да жыцця.

У працэсе эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі значная роля належыць навучальным і вучэбна-выхаваўчым установам. У матэрыялах гэтага артыкула хацелася б падзяліцца з чытачамі звесткамі аб асаблівасцях эстэтычнага выхавання моладзі ў сферы дзейнасці пазашкольных навучальных устаноў, у першую чаргу цэнтраў эстэтычнага выхавання, дамоў народнай творчасці і рамёстваў.

З другой паловы 1990-х гг. у нашай рэспубліцы пачала ажыццяўляцца рэарганізацыя ўстаноў, якія займаліся праблемамі развіцця народнай творчасці. Былі ліквідаваны рэспубліканскія дамы народнай творчасці і мастацкай самадзейнасці, што курыравалі гэты пласт духоўнай культуры на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Перапынілі дзейнасць шматлікія творчыя клубы, якія выраашалі цэлае кола задач мастацка-творчага і выхаваўчага кірунку, зменшылася колькасць студый выяўленчага мастацтва пры прафсаюзных клубах і дамах культуры. Формы кіравання працэсам развіцця народнага мастацтва, якія выкарыстоўваліся на працягу многіх дзесяцігоддзяў, паступова саступалі месца новым метадам арганізацыі масавага руху ў засваенні, захаванні і развіцці нацыянальных мастацкіх каштоўнасцей.

Абласныя цэнтры народнай творчасці (навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культасветработы), якія пра-

цягвалі працаваць у новых умовах, акцэнтавалі ўвагу на рабоце раённых цэнтраў народнай творчасці пры аддзелах культуры. У раённых гарадах, гарадскіх пасёлках, у саўгасах і калгасах арганізоўваліся дамы рамёстваў, цэнтры народнай творчасці, дамы майстроў. У сваёй дзейнасці яны аб'ядноўвалі не толькі вопытных, вядомых у рэспубліцы народных майстроў, але і моладзь, школьнікаў і дзяцей дашкольнага ўзросту.

За апошнія дзесяць год у Беларусі створана і паспяхова функцыяніруе звыш за 50 дамоў і цэнтраў рамёстваў. Толькі ў Віцебскай вобласці працуе 20 адпаведных выхаваўча-творчых устаноў, у якіх дарослымі і дзецьмі засвойваюцца разнастайныя віды рамяства — ткацтва, вышыўка, выцінанка, саломапляценне, разьба па дрэве, ганчарства і інш. Так, напрыклад, у Лепельскім Доме рамёстваў у 30 гуртках вядзецца мастацкае выхаванне як школьнікаў, так і дарослых. Амаль 250 лепельчан актыўна ўліліся ў вучэбна-творчы працэс у гэтай культурна-творчай установе. Дамы рамёстваў умела выкарыстоўваюць веды і вопыт старэйшых носьбітаў аўтэнтычнага народнага мастацтва. Народныя майстры адраджаюць яго забытыя віды і перадаюць майстэрства маладому пакаленню.

Каб падтрымліваць цесныя творчыя сувязі з аддаленымі вёскамі раёна, Лепельскі Дом рамёстваў стварыў у сельскай мясцовасці філіялы. Так, у вёсцы Чэрцы працуе гурток саломапляцення, у вёсцы Валасовічы — лозапляцення, а вёска Домжарыцы стала цэнтрам ткацтва. Акрамя практычнай творчай дзейнасці Дом рамёстваў займаецца навукова-даследчай, пошукавай работай. Пастаянна наладжваюцца этнаграфічныя экспедыцыі па вёсках раёна, адшукваюцца старадаўнія бытавыя рэчы і прадметы народнага мастацтва, якія потым становяцца каштоўнымі экспанатамі музея, узорамі для адраджэння традыцыйных відаў ткацтва, вышыўкі, набіванкі, ганчарных і бандарных вырабаў, пляцення — усяго таго, што было патрэбным у паўсядзённым жыцці нашых продкаў.

Немалаважнае значэнне ў рабоце Дома рамёстваў надаецца прапагандыцка-асветным пытанням. Тут чытаюцца лекцыі і праводзяцца экскурсіі для жыхароў Лепельшчыны, гасцей горада і раёна. Работнікі Дома рамёстваў расказваюць аб дзейнасці творчых гурткоў, мясцовых традыцыях, а таксама аб народных майстрах, мастаках, заслужаных людзях раёна.

Народныя майстры, самадзейныя мастакі Лепельшчыны пастаянна прымаюць удзел у абласных і рэспубліканскіх выставах, кірмашах і святах. Іх творчыя работы можна сустрэць на перасоўных выстаўках і ў далёкім замежжы — Галандыі, Францыі, Бельгіі, Германіі. Карціны В. Жарнасека і П. Жарнасека, гліняныя цацкі З. Ляйко, выцінанкі Л. Казачонак, вырабы з лазы і стружкі Л. Саланенкі, тканыя ручнікі Н. Бабровіч і творы іншых мастакоў і майстроў з'яўляюцца ўзорамі сапраўднага, высокага народнага мастацтва.

Дамы рамёстваў — гэта новыя вучэбна-творчыя, выхаваўчыя і арганізацыйна-метадычныя структуры раённага звяна ў галіне народнай мастацкай творчасці і эстэтычнага выхавання. Яны запоўнілі арганізацыйна-метадычны вакуум, які стварыўся пасля ліквідацыі рэспубліканскіх навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культасветработы і Міжсаюзнага Дома самадзейнай творчасці. Дамы рамёстваў сталі сапраўднымі цэнтрамі народнай мастацкай культуры. Тут развіваецца аўтэнтычнае мастацтва, стваральнікамі якога з'яўляюцца мясцовыя жыхары. Дамы рамёстваў абудзілі і вяртаюць той багаты, глыбока народны патэнцыял духоўнасці, які па прычыне згубнага ўплыву тэхнічнага прагрэсу, урбанізацыі і сацыяльных змен у сучасным жыцці грамадства, здавалася, беззваротна мог бы адысці ў нябыт. Аднак сёння ўжо можна з упэўненасцю сказаць, што будуць працягвацца і развівацца народныя мастацкія традыцыі і што захаваецца надалей багацце традыцыйнай нацыянальнай культуры, паколькі ў вывучэнне, адраджэнне і захаванне нашай спадчыны актыўна ўключылася моладзь,




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Народныя майстры Гіль Тамара Васільеўна і Кавалік Ніна Іванаўна, в. Талуць Вілейскага раёна

якая пераймае духоўную эстафету ад старэйшых.

Некалькі гадоў паспяхова працуе Вілейскі раённы Дом рамёстваў. Галоўнае дасягненне Дома рамёстваў, як зазначыў яго дырэктар С. А. Дубяга, — гэта далучэнне шматлікай колькасці дзяцей і дарослых да мастацкай творчасці, да вывучэння і засваення народных традыцый у такіх відах рамяства, як саломапляценне і лозапляценне, разьба па дрэве, роспіс, вышыўка, ткацтва, бандарства і інш. Кіраўнікі гуртка лозапляцення — С. Ч. Макарэвіч Ю. М. Ільін, гуртка саломапляцення — Ю. В. Смолік і іншыя шчодра дзеляцца творчым майстэрствам з выхаванцамі. Акрамя таго, Ю. М. Ільін арганізаваў і вядзе гурток пчалярства, у якім вучні з вялікай зацікаўленасцю засвойваюць сакрэты гэтага старажытнага рамяства. Вілейскі Дом рамёстваў таксама мае свае філіялы ў буйных населеных пунктах, што дае магчымасць прыцягнуць да мастацкага выхавання і творчага працэсу аматараў народнай творчасці з аддаленых ад цэнтра вёсак.

Пры Вілейскім раённым Доме рамёстваў дзейнічае народны клуб майстроў «Вытокі», членамі якога з'яўляюцца 28 дзяцей і дарослых. Клубам праводзіцца не толькі вучэбна-творчая работа, але і работа па выяўленні народных умельцаў, правядзенні выстаў, удзеле ў святах і конкурсах народнага мастацтва.

Актыўную работу па ўключэнні ў навучальны і творчы працэс працаўнікоў горада і сяла, дзяцей малодшага ўзросту праводзяць дамы рамёстваў Аршанскага, Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Глыбоцкага, Полацкага і іншых раёнаў Віцебскай вобласці. Гэта не выпадковыя кампаніі для справаздачы раёнаў аб культурна-асветнай дзейнасці з насельніцтвам, а рэальная і паслядоўная работа сапраўдных цэнтраў творчасці, цэнтраў па вывучэнні фальклору і народных мастацкіх традыцый пэўнага рэгіёну, па засваенні і адраджэнні іх на новым вітку жыцця нашага грамадства. У кожнай вобласці рэспублікі дамы рамёстваў працуюць па пэўных кірунках і праграмах і ажыццяўляюць пастаянную сувязь з дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі па правядзенні абласных і рэспубліканскіх свят, конкурсаў, фестываляў мастацтва.



На занятках па выяўленчым мастацтве ў Доме майстроў, в. Каловічы Вілейскага раёна



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Працуе гурток саломапляцення ў в. Талуць Вілейскага раёна

Як гарадскія, так і сельскія дамы рамёстваў з'яўляюцца не толькі цэнтрамі эстэтычнага выхавання дзяцей і юнацтва, але і сапраўднай школай навучання, трансляцыі традыцый народнага мастацтва маладому пакаленню ў наш складаны тэхнакратычны век. Менавіта дамы рамёстваў (дамы народнай творчасці, фальклору) з'яўляюцца сучаснай мадэллю ўстановы культуры, якая найбольш эфектыўна рэалізуе задачы актыўнага ўключэння людзей у эстэтычна-пазнаваўчы і мастацка-творчы працэс. Яны з'яўляюцца той першапачатковай мастацка-культурнай акадэміяй, што выхоўвае адукаваную і высокаразвітую ў эстэтычным, мастацкім, культурным і маральным сэнсе асобу.

Вучэбна-выхаваўчыя ўстановы маюць даволі шырокі дыяпазон найменняў. Яны называюцца дамамі фальклору, цэнтрамі фальклору, дамамі народнай творчасці. Напрыклад, у Акцябрскім раёне Гомельскай вобласці працуе Пратасаўскі Дом народнай творчасці, які аб'ядноўвае 40 народных майстроў, спевакоў, музыкантаў і інш. Распаўсюджанымі відамі народнай творчасці тут з'яўляюцца ткацтва, пляценне, вышыўка, сталярства, цяслярства.

У апошні час у рэспубліцы функцыяніруе, як ужо адзначалася, звыш за 50 дамоў (цэнтраў) рамёстваў (з іх 17 — сельскіх), 30 дамоў (цэнтраў) фальклору, 43 школы народнай творчасці. Так, у Віцебскай вобласці налічваецца 20 дамоў рамёстваў, у Мінскай — 8, Магілёўскай — 10, Гродзенскай — 7, Брэсцкай — 5. Утвараліся яны неадначасова. Так, напрыклад, Асіповіцкі Дом рамёстваў працуе з 1994 г. Ён аб'ядноўвае 45 майстроў па пляценні, ткацтве, мастацкай апрацоўцы дрэва, ганчарстве. Акрамя таго, тут працуюць 4 гурткі дэкаратыўна-прыкладной творчасці і студыя выяўленчага мастацтва.



Сардэчна запрашаюць на свята народнай творчасці ў Дом майстроў, в. Каловічы Вілейскага раёна

1. *Грыгаровіч, Я. Д.* Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект. — Мн. : Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. — С. 11—65.

2. *Салеев, В. А.* Концепция эстетического воспитания детей и молодежи Республики Беларусь // Асновы мастацтва. — 2000. — № 4. — С. 9—30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ